ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ
МІНСКІ ГАРАДСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
УПРАЎЛЕННЕ КУЛЬТУРЫ

праводзяць міжнародную навукова-практычную канферэнцыю
«МІНСК І МІНЧАНЕ: 10 СТАГОДДЗЯЎ ГІСТОРЫІ.
КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ГОРАДА (ДА 945-ГОДДЗЯ МІНСКА)»
Час правядзення: 6–7 верасня 2012 г.
Месца правядзення: г. Мінск, Інстытут гісторыі Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

Праблемы для абмеркавання:

- Асобныя дакументы, фонды і калекцыі па гісторыі Мінска ў айчынных і замежных архівах і бібліятэках.
- Археалагічныя крыніцы.
- Іканаграфічныя крыніцы.
- Картаграфічныя крыніцы.
- Новыя знаходкі.
- Новыя інтэрпрэтацыі старых крыніц.

Рабочыя мовы канферэнцыі: беларуская, руская, польская.

Заявы на ўдзел у канферэнцыі і тэксты дакладаў прымаюцца строга да 15 красавіка 2012 г. Тэксты дакладаў будуць апублікаваны да пачатку канферэнцыі.У заяве паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, яго кантакты. Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору заяў на ўдзел у канферэнцыі і тэкстаў дакладаў! Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да 1 чэрвеня 2012 г.
Патрабаванні да формы і аб'ёма тэкстаў дакладаў: электронны варыянт не болей за 40 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

Заявы на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце: pirus@tut.by.

Кантакт: Аляксандр Іванавіч Груша, 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі. Тэл. (017) 284-16-31, факс (017) 284-18-70, e-mail:pirus@tut.by

Пражыванне і праезд аплочваецца ўдзельнікамі канферэнцыі.